МЕТАДЫЧНАЯ РАСПРАЦОЎКА
**СВАЯ ГУЛЬНЯ**
**“ДЗЯРЖАЎНЫЯ СІМВАЛЫ МАЁЙ РАДЗІМЫ”**

**Мэта** – папулярызацыя дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь.

**Задачы:**
пашырыць веды пра дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь;
фарміраваць уменне працаваць у мікрагрупах, развіваць памяць і лагічнае мысленне вучняў;
выхоўваць паважлівыя адносіны да дзяржаўнай сімволікі.

**Удзельнікі:** вучні 7–9 класаў.
**Форма правядзення:** інтэрактыўная інтэлектуальная гульня.
**Месца правядзення:** каля стэнда “Дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь”.
**Абсталяванне:** мультыборд, прэзентацыя гульні (Power Point), мяшэчак з жэтонамі, чорная скрыня, падарункі ўдзельнікам.

## ХОД ГУЛЬНІ

– Добры дзень усім, хто знайшоў час завітаць на наша мерапрыемства.
А чаму яно прысвечана, вы зразумееце, калі адгадаеце загадкі.

Ёсць важная песня ў нашай краіны.
Пачуўшы яе, мы ўстаць усе павінны.
Адзінству людзей у ёй спяваецца слава,
І ўсхваляецца наша дзяржава. *(Гімн.)*

Калі пайшлі мы на парад,
Яго нёс мой старэйшы брат.
Нам нельга без яго ніяк,
Бо гэта беларускі … *(сцяг.)*

Ён дапаўняе гімн і сцяг.
У краіне ён – галоўны знак.
Святыя сімвалы ён мае.
Як ён завецца? Хто з вас знае? *(Герб.)*

– Герб, сцяг, гімн… А што яны складаюць цалкам? (Дзяржаўную сімволіку.) Так, сапраўды, гэта дзяржаўная сімволіка нашай краіны, якая мае прыгожую назву – Беларусь.

*Вучань чытае на памяць верш Ю. Свіркі “Твая Беларусь”.*

На карце вялікага свету
Яна як кляновы лісток,
Песня гарачага лета,
Крынічнай вады глыток.

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой
Твой родны край, твая Айчына,
Жыццё тваё і гонар твой.
І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая Радзіма
Названа светла: Беларусь!

─ Сёння мы з вамі пагуляем у інтэлектуальную гульню "Дзяржаўныя сімвалы маёй Радзімы" і праверым, як вы ведаеце дзяржаўную сімволіку Рэспублікі Беларусь.

*(Прадстаўленне каманд.)*

─ На працягу ўсёй гульні, кожная каманда будзе набіраць балы. Пасля таго як скончыцца гульня, журы падлічыць вашы балы. У якасці журы будуць выступаць.....

*(Прадстаўленне журы.)*

─ На слайдзе вы бачыце поле інтэлектуальнай гульні з тэматычнымі назвамі (Дадатак).

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лічбы і даты** | **10** | **20** | **30** | **40** | **50** |
| **Герб** | **10** | **20** | **30** | **40** | **50** |
| **Сцяг** | **10** | **20** | **30** | **40** | **50** |
| **Гімн** | **10** | **20** | **30** | **40** | **50** |

Лічбы – гэта вашы балы, вы выбіраеце тэму і кошт пытання.

10 і 20 – гэта вельмі лёгкія пытанні, 30 і 40 – больш складаныя, 50 – вельмі складаныя.

Калі вы адказваеце на пытанне правільна, то зарабляеце пэўную колькасць балаў.

Засталося толькі высветліць, хто пачне гульню. Выцягніце з мяшэчка жэтон. Першай пачне тая каманда, якая выцягне жэтон чырвонага колеру.

*(Вучні па чарзе выцягваюць жэтоны. Потым адзін з удзельнікаў каманды падыходзіць да мультыборда, выбірае тэматыку і кошт пытання, клікае па лічбе. Пытанне зачытваецца ўслых. )*

**Пытанні і адказы інтэлектуальнай гульні:**

**<u>Лічбы і даты</u>**

**10 –** Якую частку шырыні сцяга займае чырвонае палатно? *(2/3 шырыні сцяга.)*

**20 –** Якую частку даўжыні сцяга займае арнамент? *(1/9.)*

**30 –** Назавіце прапарцыянальныя адносіны шырыні сцяга да яго даўжыні? *(1:2)*

**40 –** Калі ў нашай краіне адзначаецца Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь? *(2-я нядзеля мая (кожны год).)*

**50 –** Калі адбылося ўрачыстае адкрыццё Плошчы сцяга ў горадзе Мінску? *(2 ліпеня 2013 года.)*

**<u>Герб</u>**

**10 –** Выявы якіх раслін змяшчае Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь? *(Лён, канюшына, жыта.)*

**20 –** Назавіце дату апошняга змянення выявы Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь. *(4 студзеня 2021 года.)*

**30 –** Што сімвалізуе 5 промняў Чырвонай зоркі на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь? *(Сувязь, сяброўства людзей усіх пяці кантынентаў планеты Зямля; дружалюбны характар нашага народа.)*

**40 –** Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь мае вялікае афіцыйнае значэнне, таму яго нельна свабодна выкарыстоўваць. Якім асобам дазваляецца размяшчаць выяву Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь на візітных картках? *(Дзяржаўным служачым.)*

**50 –** Каму забараняецца выкарыстанне Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь у якасці асновы афіцыйных геральдычных сімвалаў? *(Забараняецца выкарыстанне ў якасці эмблем рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў (асацыяцый), фондаў, Беларускай натарыяльнай палаты, беларускай Рэспубліканскай калегіі адвакатаў, Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, Палаты падатковых кансультантаў, пастаянна дзеючых трацейскіх судоў, створаных у якасці некамерцыйных арганізацый, прыватных устаноў адукацыі.)*

**<u>Сцяг</u>**

**10 –** Які колер Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь сімвалізуе сабой маральную чысціню і мудрасць? *(Белы.)*

**20 –** Што сімвалізуе арнамент? *(Даўнюю культуру народа, духоўнае багацце, адзінства.)*

**30 –** Якога колеру павінна быць дрэўка (флагшток), на якое прымацоўваецца Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь? *(Залацістага (охра).)*

**40 –** Назавіце абавязковую ўмову размяшчэння сімволікі, калі неабходна падняць або ўстанавіць Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь і сцяг іншай дзяржавы. *(Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь павінен быць падняты або ўстаноўлены з правага боку, а сцяг іншай дзяржавы – з левага, калі стаяць тварам да іх.)*

**50 –** У дні жалобы, абвешчаныя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца ў жалобным

афармленні. Апішыце гэта афармленне. *(У гэтым выпадку да верхняй часткі дрэўка Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь прымацоўваецца стужка чорнага колеру, даўжыня якой роўная даўжыні палотнішча сцяга. Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, усталяваны на флагштоку, прыспускаецца на 1/3 даўжыні флагштока.)*

**<u>Гімн</u>**

**10** – Назавіце радкі Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, якія паўтараюцца тройчы.

*(Слаўся, зямлі нашай светлае імя,*
*Слаўся, народаў братэрскі саюз!*
*Наша любімая маці-Радзіма,*
*Вечна жыві і квітней, Беларусь!)*

**20** – Аўтар тэксту Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь Уладзімір Іванавіч Карызна выкарыстаў фрагменты папярэдняга тэксту гімна. Хто быў яго аўтарам? *(Міхаіл (Міхась) Клімковіч)*

**30** – Назавіце імя, імя па бацьку і прозвішча аўтара музыкі Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. *(Нестар Фёдаравіч Сакалоўскі.)*

**40** – Як павінны слухаць афіцыйнае выкананне Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь мужчыны, якія не з’яўляюцца ваеннаслужачымі? *(Стоячы, без галаўнога ўбора.)*

**50** – Пры вакальным і вакальна-інструментальным выкананні Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь павінен гучаць цалкам, а як ён можа гучаць пры інструментальным выкананні? *(Дапушчальна частковае выкананне – праігрываецца запеў і прыпеў адзін раз.)*

— А зараз мы з вамі вызначым “Самага знаходлівага” з кожнай каманды. Гэты конкурс для кожнага з вас. Той, хто справіцца з заданнем, перадае свой ліст з адказамі для праверкі журы.

**Заданне ўдзельнікам:**

Запішыце на лістку паперы 10 назваў беларускіх гарадоў, 10 назваў беларускіх рэчак і 5 назваў беларускіх азёр.

— Пакуль журы падводзіць вынікі гульні, а ўдзельнікі спаборнічаюць за тытул “Самага знаходлівага”, прапаную заданне гледачам.

*(Вучань прыносіць чорную скрыню.)*

**Заданне гледачам:**

У чорнай скрыні знаходзіцца прадмет, з якім павінен выкарыстоўвацца Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь пры цырымоніях і іншых урачыстых мерапрыемствах. Назавіце гэты прадмет, яго форму і матэрыял, з якога ён

зроблены. *(Наканечнік ромбавіднай формы з выявай 5-канцовай зоркі з металу жоўтага колеру.)*

*(Пераможца гульні з гледачамі атрымлівае прыз.)*

*(Журы падводзіць вынікі гульні, вызначае "Самага знаходлівага" ўдзельніка, узнагароджвае канкурсантаў.)*

— Закончыць наша мерапрыемства мне хочацца радкамі варша Рыгора Барадуліна:

Быць Беларусам —
Гэта значыць
Свайго ні гуку не забыць,
Усё чужое перайначыць,
Каб Беларусі вечнай быць!
Быць Беларусам —
Гэта значыць
За родны край згараць на дым,
Па-беларуску чуць і бачыць
На гэтым свеце і на тым.

Дадатак

**Поле інтэлектуальнай гульні**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Лічбы і даты | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| Герб | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| Сцяг | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |
| Гімн | 10 | 20 | 30 | 40 | 50 |

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА

“Гімназія г. Мсціслава”
Мядзведская І.М.